

ПУЦЯВОДНАЯ ЗОРКА КУПАЛЫ

4

ФАКТАР «Х» ВЯРТАЕЦЦА

5




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

8 ЛІПЕНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 132 (29754)

**ЛІЧБА ДНЯ**

**$7 506,2 млн**

*у эквіваленце склалі, паводле папярэдніх даных, міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 ліпеня 2022 года. За чэрвень золатавалютныя рэзервы выраслі на $96,6 млн (на 1,3 працэнта) пасля зніжэння ў маі на $351,5 млн (на 4,5 працэнта). Пры гэтым у чэрвені ўрадам выканана знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля $210 млн у эквіваленце. Акрамя таго, негатыўны ўплыў на паказчык міжнародных рэзервовых актываў аказала пераацэнка манетарнага золата і спецыяльных правоў пазыкі Міжнароднага валютнага фонду, адзначылі ў Нацбанку. Падтрыманню ўзроўню золатавалютных рэзерваў садзейнічала купля Нацыянальным банкам замежнай валюты на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы.*



# ЧАРАЎНІЦТВА КУПАЛЬСКАЙ НОЧЫ



Казачна прыгожа правялі абрад Купальскай ночы ў пасёлку Парычы Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці. Удзельнікі свята прайшлі шэсцем ад мясцовай школы да Дома культуры, які знаходзіцца на маляўнічым беразе Бярэзіны. Пасля тэатралізаванага паказу і канцэртнай праграмы каля тысячы гледачоў, якія прыехалі на свята, з захапленнем і апладысментамі назіралі за танцам з агеньчыкамі ды паходнямі, які выконвалі тутэйшыя дзяўчаты.

**Віктар ДРАЧОЎ, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па г. Мінску Наталля Качанава правяла нараду з кіраўніцтвам сталіцы. У нарадзе ўзялі ўдзел памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь—інспектар па г. Мінску Аляксандр Барсукоў, міністр унутраных спраў, упаўнаважаны Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па г. Мінску Іван Кубракоў, старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў, намеснікі старшыні Мінскага гарвыканкама, кіраўнікі адміністрацый раёнаў сталіцы.**

ISSN 1990 — 763X

Бяспека дзяцей

## НА АДЛЕГЛАСЦЬ ВЫЦЯГНУТАЙ РУКІ




**Фотаўспаміны пра летні адпачынак у сацыяльных сетках стракацяць здымкамі ў модным ракурсе. Фатограф пакідае ў кадры сваю руку, з якой не выпускае далонь роднага чалавека, знятага са спіны. Прапаную гэтым летам усім бацькам малалетніх дзяцей падчас чарговага адпачынку каля вадаёма зрабіць такое фота са сваім дзіцем. Няхай здымак з бясцэннай далонькай у руцэ, як праваднік, давядзе да свядомасці адну з галоўных запаведзяў ад ратавальнікаў — не адпускай дзіця ў вадзе далей, чым на адлегласць выцягнутай рукі. Мамы і таты з Жыткавіцкага, Пухавіцкага, Мастоўскага, Светлагорскага раёнаў, на жаль, такіх кадраў са сваімі дзецьмі ўжо ніколі не зробяць.**

### Вера, што знойдуць жывымі

На Гомельшчыне за тыдзень у Прыпяці і Бярэзіне патанула двое дзяцей. Дзяўчынкі 8 і 4 гадоў. У абодвух выпадках вада забрала іх, калі бацькі былі побач, але прыбралі тую самую «руку з кадра». Дарослыя адпачывалі на беразе, дзеці засталіся на некаторы час без нагляду.

У Жыткавіцкім раёне каля вёскі Хваенск у момант трагедыі жанчына пайшла ў палатку ўкладваць спаць двухгадовага сына. Дочкі 9 і 8 гадоў засталіся каля ракі адны. Калі маці вярнулася, малодшай ужо не было. Пазней яе знайшлі вадалазы.

СТАР. 3

«ПаБАЗАРым»

## Зазззяе горад мільёнамі агнёў

**Святочная атмасфера ў горадзе над Дзвіной мацнее з кожным днём. Да аднаго з галоўных культурных свят краіны ў бесперапынным тэмпе рыхтуюцца арганізатары і ўдзельнікі, а госці з 73 краін свету, для якіх квіток з валошкай стаў візай, нецярпліва чакаюць свае цягнікі і самалёты. Мы даведаліся, як фестывальная сталіца рыхтуецца да «Славянскага базару».**

Добраўпарадкаванне горада мясцовыя ўлады пачалі яшчэ вясной. Набыў новае аблічча Кіраўскі мост над Дзвіной, які злучае цэнтральныя фестывальныя вуліцы Кірава і Замкавую. Актыўна вядзецца рэканструкцыя яшчэ аднаго моста каля канцэртнай залы «Віцебск». Тут, дарэчы, будуюць пляцоўку для канцэртаў у новым фармаце open-air. На шматлікіх вулачках заменена дарожнае палатно пасля вясновай непагадзі, а на прыдамовых тэрыторыях наводзяць прыгажосць гаспадары. Гатэлі павышаюць узровень камфорту для адпачынку гасцей.

СТАР. 4

# «Нам патрэбна прыняць мора законаў дзеля развіцця палажэнняў новай Канстытуцыі»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Старшыню Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіміра Андрэйчанку. Спікер ніжняй палаты парламента далажыў аб выніках работы восьмай сесіі сёмага склікання, якая днямі завяршыла сваю работу, а таксама расказаў аб перспектывах заканадаўчай дзейнасці Палаты прадстаўнікоў.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ён у курсе работы парламента, вынікаў гэтай сесіі, і папрасіў расказаць аб праблемах, калі яны ёсць. «Я рады, што мы ўсё-ткі робім упор на работу цяперашняга парламента: дэпутаты ўжо вопытныя, уцягнуліся ў работу, — падкрэсліў беларускі лідар. — Цяпер вялікі масіў нарматыўна-прававой работы, нам патрэбна прыняць мора законаў дзеля развіцця палажэнняў новай Канстытуцыі».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што роля парламента ў новай Канстытуцыі значна павялічылася. Гэта, па яго словах, нядрэнна, але да такой акалічнасці павінны быць гатовыя дэпутаты.

У сувязі з абноўленай Канстытуцыяй задач перад парламентарыямі пастаўлена нямала. «Гэта і новыя законы, у тым ліку «Аб Усебеларускім народным сходзе», і па эканоміцы прыйдзецца карэктаваць, па пераразмеркаванні паўнамоцтваў, што мы ў прынцыпе робім ужо даўно, — заўважыў Прэзідэнт. — Я думаю, мы справімся з гэтымі пытаннямі. Устаноўка няпростая, але людзі шмат зразумелі, у тым ліку асобныя нашы дэпутаты, крыўдзіцца няма за што».

Таксама Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што цяпер мы вельмі актывізаваліся ў рабоце на расійскім кірунку: «Захоўваючы суверэнітэт і незалежнасць, мы павінны зрабіць максімум па кааперацыі ў эканоміцы, па нашым адзінстве, яднанні — усё зрабіць для таго, каб ніхто не мог кінуць камень у нас, што мы не вырашылі пэўныя пытанні ва ўзаемаадносінах з Расіяй. Таму расійскі кірунак часткова абазначаны ў тых дарожных картах або саюзных праграмах, як мы іх называем. Усё гэта патрэбна ўвасабляць у законы, пры гэтым бачачы нашу дзяржаву ў перспектыве як суверэнную і незалежную».

Падчас восьмай сесіі дэпутацкім корпусам было разгледжана 60 законапраектаў. 15 з іх — у першым чытанні, столькі ж — у другім. У двух чытаннях дэпутаты адобрылі 13 законапраектаў, а таксама 17 пагадненняў аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў. Бягучая заканадаўчая дзейнасць Палаты прадстаўнікоў накіравана на рэалізацыю даручэнняў Прэзідэнта, прывядзенне законаў у адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй — з 90 законаў, якія неабходна прыняць да сакавіка 2024 года, патрэбныя змяненні ўжо ўнесены ў восем законаў (першае чытанне) і 17 законаў (другое чытанне). Шэраг прынятых парламентарыямі законапраектаў звязаны з падтрымкай эканомікі і пераразмеркаваннем паўнамоцтваў паміж органамі дзяржаўнай улады. Сем законапраектаў, чатыры з якіх ужо прыняты на восьмай сесіі, былі ўнесены ў Палату прадстаўнікоў па асабістай ініцыятыве дэпутатаў. Ажыццяўляецца заканадаўчае забеспячэнне і рэалізацыі Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, у тым ліку 28 саюзных праграм.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў заўсёды знаходзяцца ў прамым кантакце з людзьмі: чуюць іх праблемы, дапамагаюць іх вырашаць. Толькі за першыя шэсць месяцаў гэтага года парламентарыі правялі 5102 сустрэчы ў працоўных калектывах, арганізавалі 1065 асабістых прыёмаў, прынялі 3420 грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, разгледзелі 4430 пісьмовых і вусных зваротаў, правялі 1704 прамыя тэлефонныя лініі, інтэрнэт-канферэнцыі і іншае. Вельмі часта дэпутацкі корпус можна ўбачыць у працоўных калектывах. Неабходнасць такіх сустрэч абумоўлена сучаснымі выклікамі, на якія апошнім часам усё часцей вымушана рэагаваць наша краіна. Пачуць дакладную інфармацыю аб шматлікіх пытаннях, якія атрымалі грамадскі рэзананс, а таксама тлумачэнне дзяржаўнай палітыкі, што праводзіцца, грамадзяне маюць магчымасць з вуснаў парламентарыяў, якія з'яўляюцца нярэдкімі гасцямі на прадпрыемствах, у арганізацыях і ўстановах.

**Вераніка КАНЮТА.**

## У тэму

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:**

— За мінулую сесію намі разгледжана 60 пытанняў. Не менш напружаная работа чакаецца на наступнай, дзявятай, сесіі. Вельмі шырокі спектр пытанняў: прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з Канстытуцыяй, вырашэнне шэрагу эканамічных пытанняў, пытанні размеркавання паўнамоцтваў паміж дзяржаўнымі органамі. Прэзідэнтам пастаўлена задача захаваць набраны тэмп работы. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена распрацоўцы новых законапраектаў. Гэта такія праекты, як законы «Аб Усебеларускім народным сходзе», «Аб грамадзянскай супольнасці», змяненні і дапаўненні ў Выбарчы кодэкс. Такая работа ўжо вядзецца. Падрыхтаваны варыянт Закона «Аб Усебеларускім народным сходзе», ён праходзіць узгадненне, і думаю, што пасля разгляду ў Прэзідэнта гэты законапраект у верасні будзе прыняты ў першым чытанні. Прэзідэнтам была звернута ўвага на ўсебаковае абмеркаванне законапраектаў, каб Палата прадстаўнікоў выкарыстоўвала гэтую добрую традыцыю народнай заканатворчасці, якая была ў нас падчас абмеркавання праекта новай Канстытуцыі.

Таксама пастаўлена задача, каб мы на працягу 2022 — 2023 гадоў цалкам прывялі ў адпаведнасць з Канстытуцыяй усе законапраекты — іх каля 90, з якіх 25 ужо прынялі. Увесь гэты масіў мы павінны разгледзець да 1 студзеня 2024 года з такім разлікам, каб 25 лютага 2024 года был праведзены адзіны дзень галасавання па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў і на працягу 60 дзён пасля гэтага адбыўся Усебеларускі народны сход.

Наша пазіцыя

# Беларусь не прызнае ні адну рэзалюцыю летняй сесіі ПА АБСЕ

**У Бірмінгеме з 2 да 6 ліпеня адбылася 29-я штогадовая сесія Парламенцкай асамблеі АБСЕ, на якой была прынята Бірмінгемская дэкларацыя. Але беларускай дэлегацыі было адмоўлена ў візе для ўдзелу ў сесіі. Гэтую сітуацыю пракаментаваў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ.**

«Мы хацелі б звярнуць увагу на некалькі важных абставін, якія характарызавалі правядзенне гэтага мерапрыемства. 29-я сесія прайшла без удзелу расійскай і беларускай дэлегацый. Гэтае рашэнне было прынята насуперак усім базавым абавязацельствам і прынцыпам АБСЕ. Міжнародныя эксперты і назіральнікі ад міжнародных парламенцкіх арганізацый (у прыватнасці, ад МПС), каментуючы тэматыку і ход абмеркавання, адзначалі адсутнасць шматбаковага падыходу пры разглядзе асноўных пытанняў», — заўважыў парламентарый.

Андрэй Савіных нагадаў, што ў адпаведнасці з прынцыпамі дзейнасці ПА АБСЕ, парламенцкая дыпламатыя лепш за ўсё дапамагае пераадолець рознагалоссі. Размова з усімі бакамі не азначае раздзялення меркаванняў, а дапамагае знайсці рашэнні. «Адхіліўшы дэлегацыі Расіі і Беларусі ад удзелу ў летняй сесіі, прадстаўнікі краін калектыўнага Захаду хацелі забяспечыць сабе не проста блокавае дамінаванне падчас сесіі, яны таксама хацелі сфарміраваць хор аднадумцаў, баяліся, што выступленні дэлегацыі Беларусі, заснаваныя на логіцы, відавочных фактах і здаровым сэнсе, могуць разбурыць эмацыянальна дэструктыўную атмасферу, якая мэтанакіравана ствараецца на гэтых пасяджэннях. Гэта вельмі сумна», — канстатаваў ён.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах падкрэсліў, што беларускі бок не прызнае і не падтрымлівае ні адну рэзалюцыю, прынятую на 29-й сесіі ПА АБСЕ і не лічыць сябе звязанымі ніякімі рашэннямі, прынятымі ў адносінах да Беларусі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

З першых вуснаў

# «Усё ў нашых руках, давайце будзем дзейнічаць»

## Кадравы дзень у Прэзідэнта

**У Палацы Незалежнасці ўчора быў кадравы дзень. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў кандыдатуры новых кіраўнікоў мясцовых органаў улады, найважнейшых дзяржаўных арганізацый і рэспубліканскіх органаў.**

### «Нам трэба накарміць свой народ»

Новыя кіраўнікі з'явіліся ў дзесяці раённых цэнтраў краіны. Іван Фёдараў узначаліў Лёзненскі райвыканкам, Аляксандр Кохан — Петрыкаўскі райвыканкам. Старшынёй Брагінскага райвыканкама прызначаны Сяргей Карпенка, а Жыткавіцкага — Мікалай П'яўко. Сяргей Чаркоўскі ўзначаліць Навагрудскі райвыканкам, Андрэй Атрушкевіч — Пухавіцкі. Уладзімір Навіцкі будзе кіраваць Чэрвеньскім райвыканкамам, а Уладзімір Кніга — Глускім. Кандыдатура Валерыя Наско ўзгоднена на пасаду старшыні Краснапольскага, а Дзмітрыя Хайноўскага — на пасаду старшыні Клімавіцкага райвыканкама.

Прэзідэнт заўважыў, што яму няма неабходнасці выкладаць канкрэтыку і ставіць канкрэтныя задачы. Усе чуюць і разумеюць, што гаворыць кіраўнік дзяржавы.

«Абстаноўка няпростая, але не крытычная. Самае галоўнае, што ўсё ў нашых руках. Хачу вам нагадаць, што наперадзе голад, як усе крычаць. У свеце будзе няпроста. У вашай зоне адказнасці знаходзіцца сфера сельскай гаспадаркі. Таму зрабіце ўсё, каб сёлета арганізавана правесці ўборачную кампанію, сабраць добры ўраджай, зрабіць добрыя запасы. Мы ўвесь час гаворым на ўзроўні раёнаў, вялікіх і сярэдніх гарадоў, што трэба накарміць жывёлу, гэта правільна. Але не забывайце, што нам трэба накарміць і людзей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, назваўшы ўборачную кампанію і напаўненне стабілізацыйных фондаў вельмі важнымі пытаннямі.

Прэзідэнт таксама расказаў, што вызначыў для сябе задачай праверыць, як у раёнах ствараецца хоць бы адно дадатковае прадпрыемства, дзе будуць заняты людзі. У сувязі з гэтым ён звярнуў асаблівую ўвагу новых кіраўнікоў раёнаў на занятасць людзей. Асабліва — на дармаедаў. «У адносінах да беспрацоўных дзейнічайце так, як вы прымеце рашэнне на раённым выканкаме. Усе яны павінны быць занятыя. Бо потым мы будзем траціць велізарныя грошы не толькі для таго, каб прымусіць іх працаваць, а прывесці да розуму. Праваахоўныя органы будуць траціць вялізныя грошы. Асноўныя цяжкія злачынствы ўчыняюцца ў нецвярозым стане ў асноўным беспрацоўнымі. Звярніце на гэта ўвагу», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён паставіў задачы стварыць беспрацоўным рабочыя месцы, калі такіх няма, і прымусіць іх працаваць.

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што дысцыпліна — выканальніцкая, тэхналагічная, парадак у раёнах павінны выконвацца няўхільна.

«Наперадзе ў нас няпросты экзамен, але вытрымаць мы яго можам толькі пры высокай арганізацыі справы. На гэта я вас нацэльваю», — сказаў ён.

Пры гэтым, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, не варта забываць, што акрамя каласавых і збожжавых, дастаткова іншых культур, якія трэба ўбраць: гэта і цукровыя буракі, і лён, і бульба, і кукуруза. «Усё спрые таму, каб быў добры ўраджай па ўсіх культурах. Нам трэба накарміць свой народ і атрымаць добрыя грошы ад продажу прадуктаў харчавання», — адзначыў ён.

### «Трэба ўсё рабіць сваё»

Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў кандыдатуры новых дырэктараў найважнейшых дзяржаўных арганізацый у сектары прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу. Генадзь Цімашэвіч узначаліць дзяржаўнае знешнегандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Белспецзнештэхніка». Мікалай Балігатаў прызначаны дырэктарам ААТ «Агат — сістэмы кіравання» — кіруючая кампанія холдынга «Геаінфармацыйныя сістэмы кіравання».

Прэзідэнт пацікавіўся ў Мікалая Балігатава, як сёння працуе холдынг «Агат — сістэмы кіравання». Новы дырэктар прадпрыемства расказаў, што ў склад холдынга ўваходзяць пяць прадпрыемстваў і ўсе яны сёння працуюць. Аляксандр Лукашэнка таксама спытаўся, як «дыхае» сістэма сувязі, якую выпрацоўвае холдынг. Дырэктар расказаў, што на прадпрыемстве аналізуюць сістэму, якая існуе каля нашых граніц. «Гэта правільна, я таму задаю пытанне з улікам Украіны, там праблем мора і, як аказалася, сувязь», — заўважыў Прэзідэнт. Мікалай Балігатаў запэўніў, што сёння сувязь у нас працуе ўстойліва пры перашкодах і ціску, а баяздольнасць арміі будзе забяспечана тэхнічнымі сродкамі, выраблёнымі на прадпрыемстве.

«Але вы, калі ласка, тысячу разоў праверце, ці надзейныя яны. Гэта аб уроку ўкраінскай аперацыі. Амерыканцы і іншыя вельмі эфектыўна пастаўляюць сістэмы радыёэлектроннай барацьбы і вельмі эфектыўна працавалі супраць сродкаў сувязі, якія выкарыстоўвалі расіяне. Таму нам трэба вельмі сур'ёзную ўвагу на гэта звярнуць. І ўжо і амерыканцы, і ўсе заходнікі-спецыялісты адзначаюць, што радыёэлектронная барацьба падчас любой аперацыі — незаменная рэч. Таму я вас папрашу звярнуць на гэта асаблівую ўвагу», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на праблему імпартазамяшчэння для прадпрыемстваў ваенна-прамысловага блока. Мікалай Балігатаў і Генадзь Цімашэвіч, прызначаны сёння генеральным дырэктарам дзяржаўнага знешнегандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Белспецзнешттэхніка», адказалі, што дадзенае пытанне рэальна вырашыць.

«Трэба знаходзіць новых партнёраў і выхад з сітуацыі, але самае галоўнае для нас — выраблячь, замяшчаць тое, што мы куплялі. Не думаю, што нас азалацілі нашы заакіянскія і блізкія партнёры. Ясна, што гэта сістэма закрытая і не вельмі звездала дапамогу з боку Захаду. Не надта яны хацелі нам прадаваць усё найлепшае. Таму трэба кампаненты, камплектуючыя — усё рабіць сваё. Спадзяюся, што вы з гэтым справіцеся», — адзначыў Прэзідэнт.

***

У кадравы дзень змены адбыліся і ў кіраўніцтве рэспубліканскіх органаў. Васіль Гурскі з пасады дырэктара Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі пераходзіць на пасаду галоўнага вучонага сакратара НАН. Цімафей Жыгараў з пасады начальніка юрыдычнага ўпраўлення Нацыянальнага статыстычнага камітэта пераходзіць на пасаду намесніка старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта.

Кандыдатура Таццяны Сталяровай узгоднена на пасаду намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях. Мікалай Шчасны пераходзіць на пасаду дырэктара дэпартамента дзяржаўных знакаў Міністэрства фінансаў.

Таксама Прэзідэнт прызначыў Уладзіміра Баравікова Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Камбоджа, Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы і Рэспубліцы М'янма па сумяшчальніцтве. Да гэтага ён быў паслом Рэспублікі Беларусь у Сацыялістычнай Рэспубліцы В'етнам.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Блізкая ўлада

## Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 9 ліпеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

• першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянцін Міхайлавіч ЗАЙЧУК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

• першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч КОЗЕЛ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Генадзь Іванавіч ДЗЕНГАЛЁЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгенавіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

## Калі наваселле не прыносіць радасці

**Прэтэнзіі да якасці будаўніцтва і капрамонту сталі прычынай двух калектыўных зваротаў да старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля ІСАЧАНКІ**



Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ.

Амаль гадзіну пералічвалі тры шматдзетныя маці будаўнічыя недаробкі ў жылым доме па вуліцы Грышына, наступствы няспраўнай ліўневай каналізацыі і незавершанага добраўпарадкавання па вуліцы Бярозаўскай. Усе гэтыя шматпавярховікі на гарантыі, пабудаваныя ў новым мікраёне вуліц Калужская-Стасава. Адна з заяўніц паведаміла, што ў яе кватэры выпраўлена толькі 20 недахопаў з 96 зафіксаваных. І гэта пры тым, што дом быў здадзены два гады таму. Жанчыны сведчылі: трава на тэрыторыі каля дома не скошваецца, шмат адчыненых люкаў, металічных труб, якія тырчаць з-пад зямлі, недаробленых пляцовак для выгулу сабак, заняткаў спортам, гульняў дзяцей. Маладая маці казала пра адсутнасць на бетонным пакрыцці дзіцячай пляцоўкі гумавых дыванкоў. Яе дзіця атрымала траўму, калі ўпала з арэляў. Абурэнне выклікала, што вокны ў месцах агульнага карыстання да нядаўняга часу не мелі замкоў. Іх паставілі літаральна перад прыёмам у аблвыканкаме. «І гэта ў доме, дзе жывуць шматдзетныя сем'і», — абураліся жанчыны. Не дадае камфорту чыгунка, якая праходзіць непадалёк. Заяўніцы прасілі ўстанавіць шумапаглынальныя шчыты. Небяспечны, лічаць жанчыны, закінуты цеплапункт побач з дзіцячай пляцоўкай. Яны звярталіся ў будаўнічую арганізацыю, у абслуговую, на лінію «115», але іх не чуюць. На пісьмовыя запыты заяўніцы, па іх словах, атрымліваюць адпіскі.

Анатоль Ісачанка даручыў па працягу месяца правесці рэвізію ўказаных аб'ектаў, вызначыць новыя тэрміны выканання работ, узгадніць іх з жыхарамі, узяць пытанні на кантроль. Губернатар абурыўся тым, што фірма, якая абслугоўвае дамы, не адстойвае інтарэсы жыхароў перад забудоўшчыкам, пры гэтым атрымлівае грошы за свае паслугі.

Жыхары дома № 1 па вуліцы Кісялёва наогул не могуць засяліцца пасля капрамонту: пагоршылася работа каналізацыі — вада, нягледзячы на адсутнасць жыльцоў, пастаянна прыбывае. Жанчына, кватэра якой на першым паверсе, паведаміла, што з моманту заканчэння рамонту ў 2014 годзе яе жыллё залівала 150 разоў. Прычым знізу, пад напружаннем сцёкаў. Людзі пакуль жывуць у падменным фондзе — і калі вернуцца ў свае кватэры, невядома. «Нашы заяўкі нават у «115» не прымаюць, — скардзіліся жыхары. — Парадокс атрымліваецца: мы не жывём ў доме, а вада прыбывае».

Анатоль Ісачанка даручыў стварыць камісію, уключыць у яе ўсе зацікаўленыя службы, у тым ліку Дзяржбуднагляд, каб прааналізаваць праект, зрабіць экспертызу і ў адпаведнасці з ёй выправіць праблемы.

85-гадовая магілёўчанка прыйшла на прыём да губернатара з прэтэнзіяй да гаспадара крамы пад яе кватэрай. Яна сабрала подпісы жыльцоў, каб забараніць фірме разгружаць тавар каля дома і ставіць там машыны. Кіраўнік вобласці даручыў разабрацца ў праблеме.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# НА АДЛЕГЛАСЦЬ ВЫЦЯГНУТАЙ РУКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Светлагорску, па словах бацькі, чатырохгадовая дачка адышла з-за натуральнай патрэбы ў кусты. Праз некаторы час мужчына ўспомніў, што малая не вярнулася, пачаў шукаць. На жаль — не паспеў. Вадалазы абласнога пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада МНС знайшлі дзіця на глыбіні двух метраў і на адлегласці 10 метраў ад берага. Трагедыя здарылася ў месцы, не абсталяваным для купання. Высветліцца таксама, што некалькі гадзін бацька разам з сябрамі самастойна шукаў дзяўчынку, якая, як яны лічылі, згубілася ў кустах. Пачуўшы, што шукаюць дзіця, падняла трывогу і выклікала ратавальнікаў зусім старонняя жанчына.



### Надзея, што пачуюць

Пасля трагічных выпадкаў з дзецьмі ў Гомелі прайшло экстранае пасяджэнне абласной камісіі па справах непаўналетніх. Старшыня камісіі, намеснік старшыні аблвыканкама Уладзімір Прывалаў заклікаў узяць пад строгі кантроль бацькоў, якія прыводзяць дзяцей у месцы, забароненыя для купання і ўжываюць там алкаголь. У вобласці заклікаюць усіх, хто бачыць падобнае, паведамляць аб гэтым у міліцыю.

— Калі бацькі прывялі дзіця купацца ў забароненае для купання месца, яны не проста парушылі правіла, але паставілі пад пагрозу яго жыццё і здароўе. Гэта дастатковая падстава для прызнання, што дзеці ў такой сям'і знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, — растлумачыў пазіцыю органаў улады **намеснік старшыні абласной камісіі па справах непаўналетніх Яўген МІТКЕВІЧ.**

Вельмі сур'ёзны праступак, калі бацькі каля вады ўжываюць алкаголь, і тут жа знаходзяцца іх дзеці. Супрацоўнікі міліцыі будуць неадкладна інфармаваць органы апекі і папячыцельства аб фактах знаходжання непаўналетніх з дарослымі ў нецвярозым стане.

— Для сацыяльных органаў і праваахоўнікаў цяпер не будзе прынцыповай розніцы, дзе бацькі на вачах у дзяцей ужываюць алкаголь — у кватэры або на прыродзе, — дадаў Яўген Міткевіч.

Сёлета на Гомельшчыне 170 праваахоўнікаў штодня выходзяць на патруляванне месцаў масавага адпачынку каля вады — як прызначаных для купання, так і забароненых. З пачатку сезона яны ўжо зафіксавалі каля дзвюх тысяч парушэнняў: трація з іх — ужыванне алкаголю, каля 700 фактаў — купанне ў неўстаноўленых месцах.

Кожны дзень абыходзяць «дзікія пляжы» і ратавальнікі. Рэйды па вадаёмах, дзяжурствы на пляжах, прафілактычныя гутаркі з людзьмі, авіяцыйны маніторынг берагоў — усё гэта дзеля таго, каб папярэдзіць трагедыі на вадзе.

### Любоў, што выратуе

**Старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага рэспубліканскага таварыства ратавання на водах Павел НОВІК** звяртае ўвагу на тое, што рызыкоўныя паводзіны бацькоў з дзецьмі падчас адпачынку на вадаёмах не заўсёды звязаны з ужываннем спіртнога.

— Для бяды дастаткова некалькі секундаў. Бацькі павінны цвёрда разумець, што калі яны прыходзяць на пляж з дзецьмі, то гэта для іх не адпачынак, але пільная, беспрапынная работа па наглядзе за кожным дзіцем, — падкрэсліў Павел Новік і адзначыў, што ў рэгіёне ўсе выпадкі ўтаплення дзяцей адбыліся з-за адсутнасці нагляду за імі.

Гібель чатырохгадовай дзяўчынкі ў Светлагорску вымушае задумацца вось яшчэ над чым. У той дзень малая павінна была быць у дзіцячым садку, але засталася з маці, якая ў дэкрэтным водпуску. Дарослыя, калі ідуць на вадаём з некалькімі дзецьмі, абавязаныя ўзважваць свае сілы: ці здольныя яны гарантаваць бяспеку ўсім?

Упраўленне адукацыі ў найбліжэйшы час таксама распрацуе памяткі аб правілах паводзін каля вадаёма. У іх папярэдзяць пра небяспеку кругоў і матрацаў, дзецям да 10 гадоў парэкамендуюць купацца ў надзіманых камізэльках ці нарукаўніках.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС і УУС Гомельскага аблвыканкама.**



### «Чэк-ліст» забароненага адпачынку

**За купанне ў забароненых месцах пагражае штраф да 96 рублёў. Калі такое купанне адбылося яшчэ і ў стане алкагольнага ап'янення, то штраф вышэйшы. За ўжыванне алкагольных напояў на пляжы — санкцыя да 256 рублёў. За паўторнае падобнае парушэнне пакаранне павялічваецца да 480 рублёў, можа быць прыменены і адміністрацыйны арышт.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Даходы арганізатараў нелегальнай міграцыі ў Мексіцы перавышаюць $600 млн



Арганізацыя нелегальнай міграцыі ў Мексіцы прыносіць злачынным групоўкам вялізныя даходы. Толькі ў 2019 годзе кантрабандысты зарабілі больш за $600 млн. Пра гэта гаворыцца ў справаздачы МУС Мексікі, паведаміла ТАСС. «Аб'ём рынку можа быць значна большым», — лічаць эксперты ведамства. Паводле даных МУС, толькі за паслугі перакладчыкаў нелегальныя мігранты плацяць каля $4,5 тысячы. Мексіка з'яўляецца транзітнай краінай для соцень тысяч нелегальных мігрантаў, якія накіроўваюцца ў Злучаныя Штаты. Толькі за першыя 3,5 месяца сёлета мексіканская паліцыя затрымала больш як 115 тысяч нелегальных мігрантаў. Для параўнання: за ўвесь мінулы год іх колькасць склала каля 250 тысяч. Многія з мігрантаў разбіваюць стыхійныя лагеры недалёка ад граніцы з ЗША, дзе вымушаны жыць месяцамі ў цяжкіх умовах, чакаючы магчымасці трапіць у Злучаныя Штаты.

### У Італіі абвалілася частка ледавіка, загінулі дзевяць чалавек

Трагедыя адбылася ў выніку абвалу часткі ледавіка Мармалада ў Даламітавых Альпах, паведаміла агенцтва ANSA. Таксама стала вядома, што сем чалавек атрымалі раненні і шпіталізаваны. Галоўны пракурор Трэнта Сандра Раймондзі паведаміў аб расследаванні і вызначэнні прычын катастрофы. «Мы пагутарым з людзьмі, паглядзім відэазапісы і прыцягнем навуковы свет, каб зразумець прычыны здарэння з гідраўлічнага пункту гледжання», — распавёў пракурор. Абвал масіўнага кавалка ледавіка маглі выклікаць высокія тэмпературы — каля 10 градусаў Цэльсія на вышыні каля трох кіламетраў. Тэхнікам з альпійскай групы выратавання ўдалося вызначыць, што ледзяная маса, адарваўшыся, рухалася з шалёнай хуткасцю — да 300 кіламетраў у гадзіну. Пры такіх умовах знайсці кагосьці жывым уяўляецца малаверагодным, адзначаюць ратавальнікі. Пошукавыя работы працягваюцца.

### У Германіі ў мэтах эканоміі пачалі адключаць асвятленне і гарачую ваду



У некаторых гарадах Германіі ў мэтах эканоміі пачалі адключаць вулічнае асвятленне, паніжаць тэмпературу ў басейнах і адключаць гарачую ваду на спартыўных аб'ектах, паведаміла нямецкая газета Die Welt. Паводле інфармацыі выдання, такія захады ўваходзяць у планы эканоміі энергарэсурсаў на выпадак крызісу, звязанага з пастаўкамі газу. Die Welt не выключае, што з часам гарачая вада ў дамы таксама будзе падавацца па строга адведзеных гадзінах. Каб гэтага не адбылося, гарады і муніцыпалітэты працуюць над стратэгіяй, мэта якой — сэканоміць як мага больш газу цяпер, каб сховішчы заставаліся запоўненыя як мага даўжэй. Увядзенне экстранных мер звязана з тым, што праз тыдзень пачнуцца штогадовыя рамонтныя работы на газаправодзе «Паўночны паток — 1», калі газавая труба будзе цалкам перакрыта. У Германіі апасаюцца, што потым «кран могуць зноў не адкрыць».

# КВЕТКІ ДЛЯ ПЕСНЯРА

**7 ліпеня, у дзень 140-годдзя Янкі Купалы, у сталічным парку, які носіць яго імя, прайшла ўрачыстая цырымонія ўскладання кветак да помніка народнаму паэту Беларусі**



Мерапрыемства пачалося з абвяшчэння прывітальнага адраса Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Яго зачытаў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар ЛУЦКІ.** «Для многіх пакаленняў знакаміты Пясняр стаў пуцяводнай зоркай, прыкладам бескарыслівага служэння Айчыне. Паэт, драматург, публіцыст, сваімі творамі ён адкрываў беларусам багацце і прыгажосць роднай мовы, хараство пейзажаў, слаўную гісторыю нашай краіны. Глыбока сімвалічна, што сёлета, у Год гістарычнай памяці, мы зноў звяртаемся да купалаўскага слова як носьбіта высокай духоўнасці беларускага народа», — гаворыцца ў віншаванні. Пасля адрас быў перададзены дырэктару Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ганне Галінскай для захоўвання ў фондах.

**Міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ** у сваім выступленні адзначыў: «Творчасць Янкі Купалы з'яўляецца сапраўднай энцыклапедыяй жыцця беларускага народа, узорам сусветнай літаратуры, якую ведаюць і паважаюць па ўсім свеце».

Ва ўнісон з гэтым гучалі і словы **старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алеся КАРЛЮКЕВІЧА:** «Веліч Купалы недасягальная ў касмічнай прасторы, у якой заўсёды праз стагоддзі будуць прысутнічаць тыя творы, вершы, паэмы, п'есы, якія напісаў вялікі класік. Веліч Купалы — гэта і разуменне, што ў нас ёсць паэт сусветнага маштабу. Перакладзеныя больш чым на 100 моў народаў свету творы Янкі Купалы — яскравае таму пацвярджэнне».

Таксама ён адзначыў, што адзін з першых вядомых твораў Песняра — гэта верш з сімвалічнай назвай «Мая доля» і што доля беларусаў — быць з Купалам, заўсёды разумець і асэнсоўваць тыя сакральныя запаветы, якія ён пакінуў наступным пакаленням.



Акрамя таго, у цырымоніі ўскладання кветак узялі ўдзел міністр адукацыі Андрэй Іванец, намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі, прадстаўнікі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, нашчадкі Янкі Купалы, прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі, Беларускага саюза мастакоў, Беларускага фонду культуры, а таксама розных устаноў культуры і адукацыі сталіцы.

Незабыўную атмасферу свята дапамаглі стварыць Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», Дзяржаўны камерны хор Рэспублікі Беларусь, Музычная капэла «Санорус», выступленні дзіцячых калектываў.

**Лізавета ГОЛАД.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

# Заззяе горад мільёнамі агнёў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Больш за 50 яркіх фотазон дапаможа захаваць фестывальныя эмоцыі на памяць. Асаблівая ўвага аддаецца кветкаваму афармленню: горад усю іскрыць мільёнамі пярэстых раслін. У Дзень нараджэння горада каля Летняга амфітэатра ўрачыста адкрылася новая скульптура «Кветачніца» — жанчына, якая прадае духмяныя букецікі. Гэты аб'ект сімвалічна адлюстроўвае ўсіх жанчын, якія падчас «Славянскага базару» прадаюць кампазіцыі з рамонкаў і лілей, а часцей — валошак, і стаў новай гарадской славутасцю.

Да Міжнароднага фестывалю мастацтваў у Віцебску з'явяцца два прыпынкі грамадскага транспарту ў выглядзе нумароў службаў выратавання «101» і «112» — гэта ініцыятыва МНС — яшчэ адзін пункт на карце гарадскіх аб'ектаў, абавязковых для наведвання і фатаграфавання. Захапляльную акцыю «За бяспеку — разам!» правядзе міліцыя ў выглядзе інтэрактыўнага маршруту з каштоўнымі прызамі. Сачыць за парадкам падчас правядзення форуму праваахоўнікі будуць у незвыклых вобразах: на гарадскіх вуліцах з'явяцца конныя патрулі і міліцыянеры на рэтрааўтамабілях. Спецыяльна да валошкавага свята Беларуская чыгунка пусціць цягнік міжнародных ліній № 239/240 Віцебск—Масква—Віцебск. Ён будзе адпраўляцца з 12 да 16 ліпеня з Віцебска, а з 13 да 17-га — з Масквы.



Фота БелТА.

**Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка ацаніў гатоўнасць сцэнічных пляцовак, а таксама ўсіх гарадскіх і праваахоўных службаў, якія будуць задзейнічаны на фестывалі.**

Гэтымі днямі пачынаюць работу адкрытыя вулічныя кафэ, якія прапануюць стравы нацыянальнай беларускай кухні і адмысловыя фестывальныя сэты. Усяго падчас «славянкі» будзе працаваць каля 80 аб'ектаў нестацыянарнага гандлю і грамадскага харчавання. Па слаўнай традыцыі, на плошчы каля Летняга амфітэатра будуць цешыць гасцей смакатой падворкі Віцебшчыны.

«Славянскі базар» дае Віцебску і ўсяму паўночнаму рэгіёну ўнікальную магчымасць штогод развівацца і ўдасканальвацца. У гасцей форуму мае застацца меркаванне аб Віцебску як аб сучасным і камфортным месцы, а разам з тым такое ўражанне паспрые фарміраванню станоўчага іміджу Беларусі — гасціннай, дружалюбна настроенай і адкрытай краіны. У нашых сілах зрабіць усё, каб любы госць, які ўпершыню наведаў фестываль, зноў захацеў сюды прыехаць», — адзначыў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар ПЕТРЫШЭНКА** на пасяджэнні рэспубліканскага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні XXXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Ужо на наступным тыдні культурная сталіца заззяе мільёнамі агнёў начной ілюмінацыі і напоўніцца гукамі музыкі. Што цікавага пакажуць на фестывалі, чытайце ў наступных выпусках «ПаБАЗАРым».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

## Надвор'е

# Балтыйская свежасць прыйдзе да нас у госці

## Спачатку будзе без ападкаў, а ў выхадныя — зноў дажджы

**Няўдзячныя мы людзі, ой няўдзячныя. Калі стаяла больш за 30 градусаў, мы малілі нябёсы аб прахалодзе. А калі сапраўды пайшоў моцны летні дождж — нам ужо не падабаецца: холадна. Свежыя паветраныя масы прынясе да нас у нядзелю і вецер з Балтыкі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

А 8 ліпеня надвор'е будзе вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску. Пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі па краіне будзе згушчацца слабы туман. Вецер ноччу няўстойлівы слабы, удзень заходні слабы да ўмеранага. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ўсталюецца ў межах 8—14 цяпла, па паўднёвым усходзе Беларусі да плюс 15 градусаў, а максімальная тэмпература днём будзе ад плюс 20 да 26 градусаў. Атмасферны ціск істотна не зменіцца.

У суботу ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будуць вызначаць поле паніжанага атмасфернага ціску і франтальныя раздзелы, якія ссоўваюцца з тэрыторыі Польшчы. Уначы месцамі па крайнім захадзе, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 10—16 градусаў, а ўдзень — 20—27 градусаў.

У нядзелю тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам няўстойлівай паветранай масы балтыйскага паходжання. Уначы месцамі, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад плюс 10 градусаў да плюс 16-ці, а днём — ад плюс 18 да 25 цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу, у пачатку наступнага рабочага тыдня ў краіне захаваецца няўстойлівае надвор'е. У панядзелак уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Ноччу тэмпература паветра складзе плюс 9—16 градусаў, а ўдзень — 15—21 цяпла, месцамі слупок тэрмометра дасягне адзнакі ў 23 градусы.

Будзе дастаткова мокра і ў аўторак. У гэты дзень у многіх раёнах краіны пройдуць дажджы. Месцамі чакаюцца навальніцы, моцныя дажджы, удзень узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 9 да плюс 16 градусаў. Днём паветра прагрэецца да 21 градуса, месцамі да 23 цяпла.

Таксама ў Белгідрамеце нагадалі, што сярэдняя па Беларусі тэмпература паветра за чэрвень склала плюс 19 градусаў, што вышэй за кліматычную норму на 2 градусы. Сярэдняя тэмпература паветра ўсіх трох дэкад была вышэйшая за норму. Вельмі гарачай выдалася трэцяя дэкада з дадатнай анамаліяй 3,7 градуса. Тэмпература паветра днём на працягу месяца ў асноўным складала плюс 20—29 градусаў, а ў самыя цёплыя суткі падымалася да плюс 30 градусаў і больш. Тэмпература паветра ноччу на працягу месяца знаходзілася ў асноўным у межах плюс 10—19 градусаў. З 24 да 30 чэрвеня была адзначана інтэнсіўная хваля цяпла: на працягу сямі дзён сярэднясутачная тэмпература паветра па большай частцы тэрыторыі краіны перавышала норму на 5 градусаў і больш. У чэрвені таксама было адзначана ад аднаго да дзевяці дзён з максімальнай тэмпературай паветра плюс 30 градусаў і вышэй пры норме для дадзенага месяца 1—3 дні. У асобныя суткі трэцяй дэкады пераважна па поўдні краіны былі зарэгістраваны трапічныя ночы (мінімальная тэмпература паветра за ноч складала плюс 20 градусаў і больш).

**Сяргей КУРКАЧ.**

З нагоды

# Фактар «ікс» вяртаецца

**Яркае адкрыццё тэлесезона 2021/2022, праект-уладальнік Гран-пры XIV Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлевяршыня», вяртаецца на тэлеэкраны. Белтэлерадыёкампанія аб'яўляе старт «Фактар.by», другога сезона папулярнага вакальнага шоу. Нас зноў чакае сустрэча зорных настаўнікаў і перспектыўных выканаўцаў на музычнай арэне, каб разам знайсці той самы запаветны фактар «ікс».**

Беспрэцэдэнтны для беларускага тэлебачання шоу-праект «X-Factor у Беларусі» стаў, бадай, самай маштабнай і гучнай падзеяй мінулай восені. За магчымасць выйсці на сцэну на сваю хвілю папулярнасці і шанц быць пачутымі змагаліся тысячы смелых і крэатыўных прэтэндэнтаў. Найлепшыя з іх сталі галоўнымі героямі праекта. Яны прайшлі праз адбор на жывых кастынгах, загартоўваліся і прафесійна выраслі ў трэніровачным лагеры пад апекай сапраўдных акул шоу-бізнесу, каб падарыць тэлегледачам шэсць захапляльных фінальных канцэртаў у прамым эфіры.

Пасля фіналу праект перайшоў на бугнейшыя канцэртныя пляцоўкі, і сёння гісторыю Андрэя Панісава, трыумфатара першага сезона, і іншых фіналістаў шоу ведае без перабольшання амаль уся краіна.

А доўгачаканы другі сезон праекта «Фактар.by» стане добрай магчымасцю для ўсіх жадаючых паўтарыць поспех дэбютантаў шоу і разам з тым заявіць пра сябе і свае вакальныя здольнасці, пераадолець комплексы і боязь сцэны. Але ці засталіся яшчэ тыя, хто здолее пераканаць прынцыповых настаўнікаў і ўважлівых тэлегледачоў, што менавіта яны валодаюць фактарам «ікс», даведаемся зусім хутка.

Калі ж вы менавіта з тых, хто хоча паспрабаваць свае сілы ў такім вакальным спаборніцтве, то смела адпраўляйце сваю анлайн-заяўку (анкету і фрагменты сваіх вакальных выступленняў) на сайт www.tvr.by — форму яе знойдзеце ў раздзеле «Спецпраекты».

А навіны адносна кастынгаў і далейшых дзеянняў адсочвайце на партале медыяхолдынга і ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 169

**З 27 чэрвеня да 3 ліпеня праходзіў XXXIII Адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-100 «Мінск-2022». Пераможцам міжнародны майстар Іван Касцёнаў з Масквы – 14 ачкоў. 9 шашыстаў набралі па 12 ачкоў. Найлепшы каэфіцыент на другое месца вывеў маладога мінскага майстра Юрыя Цымановіча. На трэцім месцы — міжнародны гросмайстар з Цверы Андрэй Калмакоў. У заліку ветэранаў (60+) пераможцам патрыярх беларускіх шашак Аркадзь Плакхін. У жаночым заліку (9-е месца ў агульным турніры) найлепшай стала майстар Марыя Часнакова (Мінск). Паглядзіце прыклады гульні.**

№ 90 М. Часнакова — А. Гетманскі

**Белыя простыя:** 29, 32, 33, 34, 35, 36, 40, 41, 42, 43, 45, 46, 47, 48, 49 (15)

**Чорныя простыя:** 2, 3, 6, 7, 8, 9, 10, 12, 13, 16, 17, 18, 19, 20, 23 (15)

Юная беларуская шашыстка нанесла прыгожы ўдар віцэ-чэмпіёну свету. 1. 32-28 23:32 2. 29-23 19:30 3. 35:04+. На жаль, у далейшым перамагчы не змагла.

№ 91 А. Валюк — Ю. Цымановіч

**Белыя простыя:** 26, 27, 28, 33, 37, 38, 39, 40, 43, 45, 48 (11)

**Чорныя простыя:** 8, 10, 11, 12, 13, 14, 15, 16, 19, 24, 25, 29 (12)

Чорныя рэалізавалі лішнюю шашку з дапамогай удару. Пакажыце яго.

№ 92 Г. Выдзерка — М. Спосаб

**Белыя простыя:** 48, 49, 42, 43, 44, 45, 36, 37,38, 39, 31, 32, 33, 26, 28, 29, 25 (17)

**Чорныя простыя:** 35, 21, 22, 16, 17, 18, 19, 11, 12, 13, 15, 7, 9, 1, 2, 3, 4 (17)

Белыя з дапамогай размену выйгралі шашку. 1. 29-23! 18:29 2. 33:24 22:33 3. 39:28 19:30 4. 25:34 21-27 5. 31:22+

**№ 93**



№ 93 Міхаіл Левандоўскі (Украіна)

**Белыя простыя:** c1, h2, a3, e3, g5 (5)

**Чорныя простыя:** b4, c5, d6, h6, c7 (5)

Наступныя пазіцыі складзеныя вядучым аддзела.

**№ 94**

**Белыя простыя:** c3, e3, d4, e5, g5 (5)

**Чорныя простыя:** g3, c5, b6, h6, e7, g7 (6)

**№ 95**

**Белыя простыя:** c3, e3, d4, e5, g5 (5)

**Чорныя простыя:** g3, c5, b6, h6, e7 (5)

**№ 96**

**Белыя простыя:** c3, e3, d4, e5, g5 (5)

**Чорныя простыя:** c5, b6, h6, c7, e7, g7 (6)

**№ 97**

**Белыя простыя:** a1, c3, e3, d4, e5, g5 (6)

**Чорныя простыя:** c5, b6, h6, e7, g7, d8 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:**

Выпуск № 168 ад 24.06.22.

№ 82 c3, b2, d2, f:d4, g:g5, d:h8(f6), c7, d4,+.

№ 83 1. b2-a3 d4:b2 2. a3:g5 c5:a3 3. e1-d2 h6:f4 4. a1-b2 a3:e3 5. f2:d8+

№ 84 1. f4-g5 h6:d2 2. f2-g3 c5:e3 3. g3-f4 e3:g5 4. h4:e1+

№ 85 1. f4-g5 h2:d2 2. c1:e3 h6:d2 3. f2-g3 c5:e3 4. g3-f4 e3:g5 5. h4:e1+ Як паведаміў уладальнік картатэкі шашачных кампазіцый А. Панчанка, гэтая праблема супадае з раней апублікаванай Г. Шасцірыковым на форуме сайта ФМЖД 23.12.2019

№ 86 1. g1-f2 (ПР.1. gh4 b:e1 2. h:a3 gh6 3. ac3 e:b4 4. a:b8 ab4 5. be5+) 1...b:e1 2. gh4 e:g3 3. h:b4 (3. h:f2 de5 4. fg3 cd6 5. gh4 ef4 6. h:b4 a:c3 7. a:g3+; 3. h:e1 cb6 4. eh4 de5 5. h:e7 ef4 6. a:h8 fg3 7. hd4 gh2 8. d:a7 hg1 9. ec5 g:b6 10. a:c5+) 3...a:c3 4. a:h2+(ПР знайшлі А. Панчанка і С. Бурко)

№ 87 19, 5, 49, 28 (45) 27 (21, 50) 27, 27+

№ 88 40,11-7, 8, 3, 20, 44, 44 (29) 39+

№ 89 30,18-13, 9, 4, 23, 50+

Першымі дакладныя адказы даслалі: Л. Трафімчык (Іўе), С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР — 2022» — У ПРАМЫМ ЭФІРЫ

**Лічаныя дні засталіся да пачатку аднаго з самых яркіх і чаканых летніх свят, якое аб'ядноўвае ўсіх, хто любіць музыку, тэатр, прыкладное мастацтва, і дорыць непаўторныя ўспаміны — XXXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску — 2022». А тэлеканалы «Беларусь 1» і «Беларусь 3» па нязменнай традыцыі рыхтуюцца паказаць сваёй аўдыторыі шмат цікавага з таго, што будзе адбывацца на культурным форуме.**

На працягу ўсіх фестывальных дзён зменіцца лакацыя ў праекта «Добрай раніцы, Беларусь!» — ранішняе шоу часова «прапішацца» ў Віцебску. Акрамя таго, традыцыйна на «Беларусь 1» будуць выходзіць «Дзённікі фестывалю» пасля праграмы «Панарама». Яшчэ ў прамой трансляцыі тэлегледачы ўбачаць знакавыя канцэртныя праграмы «Славянскага базару — 2022», дзе і ўрачыстае адкрыццё (14 ліпеня), «Саюзная дзяржава запрашае...» (15 ліпеня), трансляцыі XXXI Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2022» (адпаведна 16 і 17 ліпеня), у нядзелю таксама пакажуць гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі «Натхненне жыцця» і ўрачыстае закрыццё фестывалю з выступленнем такіх вядомых артыстаў, як Алена Ваенга, Наталля Падольская, Уладзімір Прасняков, Ларыса Доліна і іншых.

А вось у эфіры сацыякультурнага «Беларусь 3» 13 і 14 ліпеня ў дзённым эфіры гледачоў чакаюць прамыя трансляцыі XX Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск». Два дні вакальных спаборніцтваў можна будзе назіраць пры жаданні з любога пункта краіны. Нагадаем, Беларусь сёлета на конкурсе прадстаўляе Елісей Касіч, а на конкурсе маладых выканаўцаў змагацца за званне найлепшай даручана Ганне Трубяцкой. Як абяцаюць арганізатары, паколькі сёлетні дзіцячы конкурс юбілейны, то ў кожным нумары будуць задзейнічаны танцавальныя і тэатральныя калектывы. І ў першы дзень прадстаўнікі краін прадставяць на суд аўтарытэтнага журы песні кампазітара сваёй краіны на роднай мове. На наступны дзень пачуем ад кожнага ўдзельніка выступленне з песняй на выбар. А 15 ліпеня падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджання даведаемся імя пераможцы. У другім аддзяленні нас чакае гала-канцэрт з удзелам выканаўцаў і членаў міжнароднага журы.

Урачыстае адкрыццё самога фестывалю, якое адбудзецца 14 ліпеня, у тэлеэфіры будзем мець магчымасць убачыць у нядзелю 17 ліпеня. Але калі меркаваць па імёнах, якія значацца ў афішы гэтага мерапрыемства, то глядзець яго і чакаць адназначна варта. Сярод артыстаў, што выступяць у гэты вечар, — Грыгорый Лепс, Сяргей Бязрукаў, Анатоль Ярмоленка, арт-гурт «Хор Турэцкага», Зара, Аляксандр Саладуха, Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Цітовіча, Тэа, Дзідзюля і многія іншыя. Трэба адзначыць, што сёлета пры стварэнні святочнай праграмы яе арганізатары імкнуліся спалучыць мінулае, традыцыі фестывалю і сучаснасць з яе дасягненнямі, каб паказаць у адзінай палітры, што хоць час і не стаіць на месцы, але душа і гісторыя «Славянскага базару» зберагаюцца кожным наступным пакаленнем. Таму сачыце за тэлепраграмай і плануйце прагляды тых мерапрыемстваў, дзе зможаце адпачыць з асалодай і пад любімыя мелодыі ды адчуць атмасферу культурнага свята міжнароднага маштабу.

**Алена ДРАПКО.**

# ЗГАДВАЦЬ І БЕРАГЧЫ



**Публіцыстычная праграма «Люблю і памятаю» адкрывае аўдыторыі «Беларусь 3» імёны і цікавыя гісторыі выдатных асоб культуры. І кожны раз яе аўтар — вядомы беларускі рэжысёр, сцэнарыст, драматург, пісьменнік Уладзімір Арлоў — распавядае гледачам малавядомыя факты з біяграфій кінематаграфістаў, літаратараў, акцёраў, музыкантаў і іншых творцаў, з якімі працаваў і сябраваў.**

На наступным тыдні нас зноў чакаюць аповеды пра эстраднага спевака, народнага артыста Беларусі Віктара Вуячыча (11 ліпеня), дырыжора, педагога, лаўрэата рэспубліканскага конкурсу аркестравых і харавых калектываў Пятра Вандзілоўскага (12 ліпеня), савецкага кінарэжысёра, сцэнарыста, акцёра, прадзюсара Генадзя Палоку (14 ліпеня).

Гэта выпускі знятыя ў розныя гады, але нават пераглядаючы іх, кожны раз адкрываеш герояў па-іншаму.

А 13 і 16 ліпеня ў эфіры сацыякультурнага выйдзе праграма «Люблю і памятаю», прысвечаная эстраднаму спеваку, народнаму артысту Беларусі Аляксандру Ціхановічу, які сёлета адзначыў бы свой 70-гадовы юбілей. У яго жыцці было шмат адметнага і многае ён паспеў зрабіць. Але галоўнае для кожнага прыхільніка яго творчасці — гэта, безумоўна, песні, якія былі і застануцца для нас назаўсёды хітамі, таму што выконвалі іх з душой. Акрамя таго, у памяць пра артыста ў суботу ў эфіры пакажуць фрагмент канцэрта «Каханне і лёс», у якім Аляксандр Рыгоравіч зноў будзе спяваць са сваёй спадарожніцай жыцця, артысткай Ядвігай Паплаўскай. Не прапусціце сустрэчу з любімымі артыстамі на «Беларусь 3».



**Алена ДРАПКО.**

